фундаментальные положения изучаемого курса, а также основную и дополнительную литературу и пр.

Только в единстве всех сторон системно-креативного обучения студентов можно обеспечить формирование специалистов как всесторонне развитых личностей, имеющих собственные знания и навыки практической деятельности.

УДК 378 (476) “17”

## АДУКАЦЫЯ ЯК ШЛЯХ У ЭЛІТУ: ПРЫКЛАД КРЫШТАПА РАДЗІВІЛА (1585-1640 гг.)

**В. У. Галубовіч**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail:ggau@ggau.by)

**Анатацыя.** У артыкуле звернута ўвага на ролю сямейнай традыцыі ў выбары прафесійнай падрыхтоўкі моладзі ў гістарычным кантэксце.

**Ключавыя словы:** адукацыя, эліта, магнаты, Вялікае Княства Літоўскае.

## ОБРАЗОВАНИЕ КАК ПУТЬ В ЭЛИТУ: ПРИМЕР КРИСТОФОРА РАДИВИЛЛА (1585-1640 гг.)

**В. В. Голубович**
УО «Гродненский государственный аграрный университет» (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail:ggau@ggau.by)

**Аннотация.** В статье рассматривается роль семейных традиций в воспитании молодежи в историческом контексте.

**Ключевые слова:** образование, элита, магнаты, Великое Княжество Литовское.

# EDUCATION AS A WAY TO THE ELITE: KRYSHTOPH RADZIVIL'S EXAMPLE (1585-1640)

**V. U. Halubovich**
EI "Grodno State Agrarian University" (Belarus, Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

**Summary.** The article focuses on the role of family tradition in the training of youth in the historical context.

**Key words:** education, elite, magnate, the Grand Duchy of Lithuania.

Вышэйшая адукацыя слушна лічыцца абавязковай умовай сацыяльнага авансу. Яна спрыяла тым, хто імкнуўся дасягнуць матэрыяльнага дабрабыту, зрабіць кар'еру, здабыць славу. Асабліва гэта датычылася асобаў з так званых ніжэйшых сацыяльных станаў. Для заможных і прыўладных адукацыя была і застаецца зараз неабходным інструментам замацавання ўласных сацыяльных пазіцый, дастаткова пераканаўчым сродкам дэманстрацыі зверхнасці над малаадукаванай масай. Веды, асабліва ў традыцыйным грамадстве, успрымаліся ў пэўнай ступені ў сакралізаваным сэнсе. Невыпадкова адукацыйная дзейнасць была ў свой час манапалізавана царквой. Разумныя бацькі здавён цудоўна разумелі, што іх будучыня ў значнай ступені залежыць ад таго, дзе і якую адукацыю атрымаюць дзеці. Таму інвестыцыі ў адукацыю не лічыліся дарэмнымі, а найбольш апраўданымі крокамі з пункту гледжання стратэгіі роду.

Айчынная гісторыя дазваляе праілюстраваць мадэлі паводзін бацькоў, якія імкнуліся гарантаваць сваім дзецям магчымасць застацца ў эліце грамадства, бадай з часоў прыняцця хрысціянства на беларускіх землях. Унікальным прыкладам такой стратэгіі з'яўляецца гісторыя "выхавання" сыноў знакамітага дзеяча часоў Вялікага Княства Літоўскага Крыштапа Радзівіла (1585-1640 гг.). Польны гетман ВКЛ з 1615 г., віленскі ваявода з 1633 г. і вялікі гетман ВКЛ з 1635 г. К. Радзівіл здолеў дасягнуць, бадай, максімальна магчымых для магната вяршыняў ва ўладнай іерархіі. Але цікавасць да яго асобы не абмяжоўваецца толькі вайскова-палітычнымі аспектамі дзейнасці. Крыштап Радзівіл выхаваў двух сыноў (Януша і Багуслава), якія, у сваю чаргу, пакінулі ў гісторыі ВКЛ неардынарны след. У сувязі з гэтым, вялікі інтарэс уяўляе тое, на што арыентаваўся К. Радзівіл, калі выбіраў накірункі штудыяў для сваіх дзяцей. Праілюстраваць гэта можна на прыкладзе адукацыі сына Крыштапа Радзівіла – Януша (1612-1655 гг.).

Уршуля Аўгустыняк, вядомая даследчыца гісторыі двара магната, адзначала, што беларуска-літоўскі магнат быў больш схільны да французскай мадэлі адукацыі, у аснове якой былі закладзены прынцыпы "*свабоды і індывідуалізму*". Папулярную на той час нямецкую мадэль, заснаваную на "*рутыне*", магнат не прызнаваў. Адметна, што французскія ўзоры так паўплывалі на К. Радзівіла, што на іх падставе ён нават падрыхтаваў у 1624 г. праект утварэння пратэстанцкай вайсковай акадэміі ў ВКЛ. На жаль, з палітычных прычын такая наватарская для нашага рэгіёна ідэя не была рэалізавана.

Пры ўсёй тэарэтычнай зарыентаванасці К. Радзівіла на французкую школу, на практыцы адукацыйны шлях яго сыноў вызначаўся больш канфесійнымі прэферэнцыямі сям'і. Сам магнат з'яўляўся лідэрам пратэстантаў у ВКЛ. Яго дзеці мусілі, адпаведна, і ў межах хатняй адукацыі, і ў час традыцыйнага для магнатаў адукацыйнага падарожжа па Еўропе, арыентавацца на пратэстанцкія каштоўнасці.

Варта адзначыць, што Крыштап Радзівіл пакінуў некалькі пісьмовых наказаў адносна таго, як належыць выхоўваць старэйшага сына, Януша. Бацька імкнуўся максімальна прагматычна падыйсці да працэсу адукацыі, што выдатна адлюстравана ў наступным выказванні: "*Я яго школьным настаўнікам мець не хачу, але добрым палітыкам і добрым Айчыны сынам*". Такі падыход абумовіў тое, што Януш мусіў працягнуць родавую традыцыю і рыхтавацца да вайсковай кар'еры. Такая падрыхтоўка уключала, тым не менш, вывучэнне некалькіх моваў (лацінскай, нямецкай, французскай, польскай, старабеларускай). У 1626 г. Януш адмыслова прасіў бацьку прыслаць наступныя кнігі: лісты Цыцэрона, камедыі Тэрэнція, падручнікі па логіцы і рыторыцы.

Выпраўляючы сына ў 1628 г. у замежныя адукацыйныя перэгрынацыі, Крыштап Радзівіл ставіў перад ім цалкам дакладныя мэты: атрымаць належную адукацыю ў галіне палітыкі. Для гэтага неабходна было, у першую чаргу, выдатна ведаць гісторыю, права і мовы. Цікава, што настаўнікі, якія суправаджалі Януша, мелі права выкарыстоўваць нават фізічныя сродкі ўплыву, г.зн., ім было дазволена лупцаваць магнацкага сынка.

На колькі меў рацыю Крыштап Радзівіл, калі вызначаў палітычны шлях як безальтэрнатыўны для сваяго сына, сведчыць кар'ера Януша, які паўтарыў дасягненні бацькі і стаў, у сваю чаргу, віленскім ваяводам і вялікім гетманам ВКЛ.

ЛІТАРАТУРА

1. Augustyniak, U. Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła (1585-1640): mechanizmy patronatu. Warszawa: Wydawnictwo naukowe Semper, 2001.

2. Wisner, H. Janusz Radziwiłł (1612-1655): wojewoda wileński – hetman wielki litewski. Warszawa: Mada, 2000.